ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 266 (1233) ‖ АЎТОРАК, 18-га лістапада 1930 г.

Ліквідаваць прарывы

Комсамольская ячэйка Нова-Дароскага с-с (Старадароскі раён) бяздзейнічае.

Пастановы XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), а таксама адозва ЦК УсеКП(б) не распрацоўваліся.

Політвучоба не праводзіцца. Росту КСМ ячэек няма, ня гледзячы на тое, што ў ячэйцы ёсьць 24 батракі. Сэкратар ячэйкі Міхневіч кажа: „Ня робім нічога, бо няма з кім“.

Райкому ЛКСМБ неабходна на гэта зьвярнуць увагу.

Ц. і А.

УДАРЫЦЬ па опортуністычнай недаацэнцы тэорыі

По шэрагу месц райкомы і ячэйкі ЛКСМБ недаацэньваюць задачу павышэньня ідэёва-політычнага ўзроўню комсамолу, у выніку чаго політвучоба зрываецца

У бой за аўладаньне марксысцка-ленінскай тэорыяй—ідэёва політычнаю зброяй бальшавізму

ЗЛАМАЦЬ рагаткі на шляху політадукацыі

Широка разгорнутае соцыялістычнае наступленьне, уся складанасьць сучаснага пэрыоду соцыялістычнай рэконструкцыі народнай гаспадаркі нашай краіны патрабуюць ад мас рабочай і працоўнай моладзі, і ў першую чаргу ад комсамольскай організацыі, высокай політычнай сьвядомасьці, аўладаньня асновамі марксысцка-ленінскай тэорыі.

Толькі поўнае разуменьне сучасных задач, соцыялістычных мэтадаў будаўніцтва, разьвіцьця эканомікі краіны, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, памножанае на рэволюцыйны энтузіязм і творчую ініцыятыву самых шырокіх рабочых і працоўных мас, ударныя бальшавіцкія тэмпы работы—забясьпечаць сапраўды вялізарныя посьпехі ў пераможным наступу соцыялізму.

Адгэтуль зусім зразумела, што разгортваньне політвучобы, найбольшы ахоп політшколамі, гурткамі бягучай політыкі і іншымі формамі сеткі політвыхаваньня мас комсамольцаў і беспартыйнай рабочай і працоўнай моладзі, максымальнае павышэньне на грунце гэтага ідэйна-політычнага ўзроўню зьўляецца надзвычайна-важнай задачай усёй КСМ організацыі і яе кіраўніцтва.

Як-жа зараз пастаўлена гэта справа ў КСМ? Што практычна зроблена ўжо, каб сваечасова распачаць політвыхаваўчую працу, паставіўшы яе якасна на належную вышыню.

Ня гледзячы на тое, што „Чырвоная Зьмена“ ужо некалькі раз сыгналізавала аб наяўнасьці рэальнай пагрозы зрыву політвучобы, высьвятляючы недапушчальна бясчынныя факты нядбайных адносін да гэтай справы, пасобнасьць з боку шэрагу РК і ячэек ЛКСМБ,—наступаючыя з месц матэр'ялы красамоўна сьведчаць аб тым, што патрэбнага становучага пералому ў гэтай галіне ўсё яшчэ няма.

Многія РК і ячэйкі стаяць на шляху шкаднейшай права-опортуністычнай недаацэнкі задач політычнага марксысцка-ленінскага выхаваньня організацыі.

Замест шпаркага пераключэньня політвучобы на ўдарныя рэйкі, яшчэ дагэтуль пачуеш развважаньні аб „адсутнасьці належнага кадру пропагандыстых“, „з політвучобай пасьпеем—зіма яшчэ далёка“ і г. д. Паасобныя комсамольскія організацыі карэнным чынам скажаюць прынцыпы добраахвотнасьці выбару форм політвучобы. „Хачу—вучуся—хачу—ня вучуся“. Небясьпечнасьць такога становішча ўскладняецца яшчэ тым, што па шэрагу месц кіраўніцтва зусім не рэагуе на шкоднасьць пералічаных фактаў і часта пляцецца ў хвасьце. Сутнасьць прыведзеных фактаў неабходна кваліфікаваць толькі як наяўнасьць праваопортуністычнай недаацэнкі важнасьці павышэньня ідэёва-політычнага ўзроўню мас організацыі, як „няўменьне злучыць паварот КСМ організацыі да гаспадарча-культурных задач з шырокім разгортваньнем політычнай адукацыі мас комсамолу“. (З пастановы ЦК УсеЛКСМ).

Асабліва зараз, пры неабходнасьці выразнага разуменьня сучасных задач партыі, пры неабходнасьці рашучага змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва, бязьлітаснай барацьбы з правым опортунізмам, спробамі скалаціць бяспрынцыпны права-„лявацкі“ блёк для барацьбы супроць партыі і яе генэральнае лініі,—такое становішча з політвучобай у організацыі трэба лічыць абсолютна нецярпімым.

Патрэбен неадкладны пералом у справе максымальнага ахопу мас комсамольцаў політадукацыйнай працай.

Трэба дабіцца, каб кожны комсамолец ясна ўразумеў, што „без рэволюцыйнай тэорыі, комсамол ня можа выхаваць бальшавікоў, міжнародных рэволюцыянэраў“. (З раш. VI Усесаюзнай Конфэрэнцыі УсеЛКСМ).

Рашуча ўдарыць па недаацэншчыках важнасьці політвучобы, якія па сутнасьці зрываюць яе правядзеньне. Узяць пад агонь бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі недахопы політвыхаваўчай работы.

Неадкладна забясьпечыць сетку політадукацыі патрэбным кадрам пропагандыстых.

На працягу бліжэйшых дзён дабіцца паўсямеснага палепшаньня становішча з разгортваньнем політвучобы.

Комсамол павінен аўладаць марксысцка-ленінскай тэорыяй—ідэйна-політычнай зброяй бальшавіка.

Папярэдзіць зрыў політвучобы

Падрыхтоўка да зімовай політвучобы комсамольскага колектыву і курсаў Менскага БПТ прайшла нездавальняюча.

Курсавыя комсамольскія ячэйкі і увесь колектыў не падрыхтаваліся да політвучобы.

Усе ранейшыя гурткі па вывучэньню бягучай політыкі, рашэньняў парт. зьездаў зараз не працуюць. Політычны ўзровень комсамольцаў, асабліва 1-га курсу тэхнікуму, зусім нізкі. Большасьць комсамольцаў зусім слаба разьбіраецца ў пытаньнях нацполітыкі. Наглядаецца недаацэнка політычнай вучобы.

Зімовая вучоба зрываецца. Бюро комсамольскага колектыву нічога не зрабіла, каб наладзіць політвучобу.

П.

Думаюць, узгадняюць і... рыхтуюць правал

Ня гледзячы на тое, што пачатак зімовай політвучобы абвешчан з 1-га кастрычніка, політвучоба ў раёне яшчэ не распачалася.

У вёсках, саўгасах, колгасах, на фабрыках і заводах большасьць політшкол не працуюць. На фабрыках „Чырвоная Бярэзіна“ і „Рабочы“ комсамольскія політшколы не ўкомплектаваны і не працуюць.

Тав. Статк віч, заг. сэктару адукацыі і быту РК КСМ, прызнаўся, што РК КСМ нічога ня робіць па пытаньню політвучобы, „але,—дадаў ён,—мы думаем аб гэтым і ўзгадняем з іншымі організацыямі“. І сапраўды, РК ЛКСМБ, ведаючы аб усіх вышэйадзначаных фактах, далей „узгадненьня“ не пайшоў.

Пытаньне аб політвучобе ня было абгаворана на райконфэрэнцыі, больш таго—у спрэчках ніхто і слова не сказаў аб політвучобе.

У некаторых ячэйках, дзе партшколы ўкомплектаваны, няма пропагандыстых. РК ЛКСМБ ня прымае ніякіх захадаў, каб пропагандыстыя былі, спадзяючыся на самацёк. Зьмест політвучобы адстае ад задач соцбудаўніцтва. Неабходны рашучы карэнны пералом. Вінавайцаў у зрыве політвучобы, опортуністых, якія недаацэньваюць важнасьці політвучобы, патрэбна прыцягнуць да суровай адказнасьці.

ВЕДАЮЧЫ.

Адарваліся ад сучаснасьці



Барысаўскі Райком:—Што за ліха!—Дзе тут соцыялістычнае будаўніцтва? А кажуць—патрэбны політычна-сьвядомыя кадры

„З ПОЛІТВУЧОБАЙ ПАСЬПЕЕМ“

Політвучоба па Нова-Слабодзкім сельсавеце ў сучасны момант не праводзіцца. Партыйна-комсамольскія організацыі ў гэтым напрамку бяздзейнічаюць. Яшчэ ні адна ячэйка сельсавету не прапрацавала рашэньняў 13 і 16 партыйных зьездаў. Сэкратар сельсавецкай ячэйкі гаворыць: „З політвучобай яшчэ пасьпеем. Наперадзе ўся зіма, можна будзе і політыкай падзаняцца“. Райком комсамолу добра ведае аб гэтым, але ніякіх мер ня прымае.

Б. М.

ПОЛІТВУЧОБЫ НЯМА

Болецкая ячэйка комсамолу яшчэ не пачала політвучобы. Сярод комсамольцаў наглядаецца політычная няпісьменнасьць, слабасьць дысцыпліны.

Неабходна ў бліжэйшы час наладзіць працу політгуртка, каб тэорэтычнай падрыхтоўкай выправіць хібы асобных комсамольцаў і вырваць іх з-пад уплыву кулацкага настрою.

Толькі аўладаўшы марксысцка-ленінскай вучобай, зможам перабудаваць сваю працу і моцна стаць на глебу соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Комсамолец.

Чакаюць новага году...

Прайшоў ужо цэлы месяц, як пачаўся тэрмін зімовай політвучобы. Але ячэйкі КСМ колгасу „Чырвоны Кастрычнік“ і „Комінтэрн“, Бягомельскага раёну, у гэтым напрамку нічога яшчэ не зрабілі. Калі комсамольцы пытаюцца ў сэкратара ячэйкі „Комінтэрн“ калі пачнуцца заняткі, дык той адказвае: „з новага году“. Тое самое гаворыць і сэкратар ячэйкі КСМ „Чырвоны Кастрычнік“—Поляк.

Патрэбна гнаць такіх сэкратароў ячэек, якія замест працы бяздзейнічаюць.

Дубок.

Дакуль гэта будзе?

Ня гледзячы на шэраг сыгналаў юнкораў праз „Чырвоную Зьмену“, політвучоба ў Лёзьненскім раёне зрываецца і з кожным днём адыходзіць на задні плян. Асабліва ў у м. Лёзна.

РК КСМ лічыць, што „займацца політвучобай немагчыма, калі працы па горла“. Такое думкі трымаецца і Райком партыі. Політвучоба павінна стаць першым памоцнікам у працы.

Рашуча змагацца са зрыўшчыкамі політ-вучобы. Не дапусьціць зрыву політ-вучобы ў гэтым годзе.

К. Кароль.

Адстаюць ад сучаснасьці

Комсамол Рагачоўшчыны і да гэтага часу ня ўзяўся за прапрацоўку 16 і 13 зьездаў УсеКП(б) і КП(б)Б, у выніку комсамольцы н ведаюць тых пытаньняў, якія стаяць перад імі. Адозва ЦК УсеКП(б) па большасьці ячэек і да гэтага часу не рэалізавана.

Калі запытаеш у некаторых комсамольцаў колектыву пэдтэхнікуму, што такое правы ўхіл і „левыя“ загібы, дык сталага тлумачэньня не атрымаеш.

Пры райкоме створаны розныя гурткі і школы па вывучэньню сучаснай політыкі. На першы дзень заняткаў зьявілася 50 чалавек, з якіх толькі 5 комсамольцаў. Комсамольцы кажуць:—„Мы ўсё тое ведаем, што там будзе“, а на самой справе выходзіць наадварот. Большасьць комсамольцаў Рагачоўшчыны політвучобай не займаецца. Комсамольцы газэт выпісваюць мала, ды і тых ня чытаюць. На „Чырвоную Зьмену“ падпісваюцца зусім слаба, кажучы, што „тут для нас няма чаго чытаць“.

У вясковых ячэйках вывучэньне бягучай політыкі пастаўлена зусім дрэнна. Кіраўнікоў для політгурткоў няма. Райкамол мала зьвяртае ўвагі на вясковыя ячэйкі.

За апошні час зусім няма росту. Большасьць батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзі—па-за шэрагамі ЛКСМБ, чаму спрые дрэнная пастаноўка політыка-выхаваўчай працы. Такой расхлябанасьці трэба палажыць канец і зараз-жа ўзяцца за політыка-выхаваўчую працу і за вывучэньне бягучай політыкі.

Я. Чарняўскі.

Заняткаў яшчэ ня было

Пры Сітніцкай ячэйцы КСМ існуе політ. школа і комсамольскі гурток па праходжаньню статуту і програмы ЎсеЛКСМ. Заняткі ў гэтых гуртках павінны былі пачацца з 1-га кастрычніка 1930 г., але да сёньняшняга дня заняткаў ня было.

Патрэбна прыняць належныя меры, каб наладзіць працу політгурткоў пры ячэйцы.

Альхоўка.

Вывучаем бягучую політыку

Комсамольская ячэйка савгасу „Зазер'е“ організавала групу навічкоў па вывучэньню ўставу і програмы ЛКСМ, а таксама бягучай політыкі. Пастанавілі прапрацаваць адозву, зьмешчаную ў газэце „Беднота“ за 24-ае верасьня.

Заняткі праводзяцца рэгулярна адзін раз у тыдзень. Пачалі займацца 1-га лістапада.

Буркун Алесь.

„Няма часу“

Ячэйка КП(б)Б і КСМ пры колгасе імя Максіма Горкага ніяк не знаходзіць часу для прапрацоўкі рашэньняў XVI-га зьезду ЎсеКП(б) і XIII-га КП(б)Б. Пастанова партячэйкі аб тым, каб займацца два разы ў тыдзень сумесна з комсамольскай ячэйкай, засталася на паперы.

Рашэньні зьездаў дрэнна популярызаваны сярод працоўнага сялянства Дамжарыцкага сельсавету.

Комсамольская ячэйка таксама не займаецца. Патрэбен пералом.

М. Гец.

Плян бальшавіцкага наступу

Савнарком БССР зацьвердзіў кантрольныя лічбы 3-га году пяцігодкі

Разьбіваючы здрадніцкі права-„лявацкі" блёк — ліквідаваць прарывы, лепш падрыхтавацца 3-га году пяцігодкі і далейшага наступу на фронце соцыялістычнага будаўніцтва

Прасунуць кантрольныя лічбы 3-га году ў масы, стаць на чале творчай ініцыятывы рабочай моладзі—баявая задача комсамолу

У падарунак зьездам

Першыя паўтара месяцы ўдарнага кварталу мінулі. Зараз мы стаім перад маленькім адцінкам часу, які аддзяляе нас ад 3-га году пяцігодкі.

3-ці год пяцігодкі зьяўляецца рашаючым годам. Зацьверджаны кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год. 3-ці год пяцігодкі паказвае, што пад правільным кіраўніцтвам комуністычнае партыі пролетарыят дасягнуў надзвычайна вялікіх посьпехаў у справе будаўніцтва сацыялізму і што трэці год пяцігодкі патрабуе яшчэ больш упартай працы, баявых бальшавіцкіх тэмпаў.

5-ты ўдарны квартал зьяўляецца баявой падрыхтоўкай да 3-га году пяцігодкі. У гэтым квартале неабходна навярстаць упушчанае за мінулыя гады і з пэўнымі посьпехамі прысьці да 3-га году.

Весткі з месц сьведчаць аб тым, што, побач з пасьпяховым выкананьнем пляваў прамысловасьці, паасобныя прадпрыемствы іх ня выканалі, зрываючы плянавыя заданьні па асобных галінах вытворчасьці.

На заводзе „Бальшавік" мы назіраем ганебнае невыкананьне, на „Энэргіі" поўную бязьдзейнасьць заводзкіх організацый у напрамку мобілізацыі грамадзкай думкі рабочых на лепшую організацыю працы, на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Рабочыя чырвонаштандартнага „Бальшавіка" ўжо зараз распрацавалі свой сустрэчны прамфінплян. Явы прыдуць да 3-га году пяцігодкі з перавышкай плянавых заданьняў на 30 проц. і гэта будзе лепшым адказам усім малаверам, усім тым хто ня верыць у творчыя здольнасьці рабочае клясы.

Ленінскі комсамол—баявы атрад пролетарыяту—змагаецца за пяцігодку. Комсамольскі колектыў „Бальшавіка", аршанскай хлебапякарні і шэрагу іншых прадпрыемстваў сапраўды здолеў стаць на чале рабочае моладзі і павесьці яе ў бойку за лепшыя паказчыкі ў выкананьні прамфінпляну.

Комсамолія „Энэргіі", Бацэвіцкага заводу „Зьвязда" ня стала на чале рабочай моладзі, не паказала сябе ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва і ўсіх новых форм творчай ініцыятывы рабочай клясы.

Час да 3-га году пяцігодкі неабходна скарыстаць для таго, каб як мага лепш да яго падрыхтавацца, па ўдарнаму скончыць ударны квартал, павесьці працу па складаньню сустрэчных прамфінпляпаў 3-га году пяцігодкі—гэта будзе лепшым падарункам комсамольскіх колектываў чарговым комсамольскім зьездам, адчыненьне якіх супадае з пачаткам 3-га году пяцігодкі.

105 проц. ёсьць!

На слуцкім скурзаводзе „Адраджэньне", дзякуючы ўдарнай працы рабочага колектыву, прамфінплян выканан на 105 проц. На заводзе з 18 чалав. організавалася ўдарная брыгада імя 13-ай гадавіны Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

Р. КОНТОР.

Кантрольныя лічбы трэцяга году пяцігодкі

Зацьверджан плян вялікіх работ 3-га году пяцігодкі. Усе прынятыя Саветам Народных Камісараў БССР капітальныя ўкладаньні, а таксама размер фінансаваньня на 1931 год зьяўляюцца папярэднімі і орыентовачнымі. Але ўсё-ж гэтыя лічбы кажуць аб вялізарнейшым размаху соцыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры БССР. Трэці год пяцігодкі—рашаючы. Дзякуючы нябачнаму ўздыму, які ахапіў рабочую клясу БССР, мы заканчваем вялікі плян пяцігодкі ў чатыры гады.

Вялізарныя посьпехі рабочае клясы

Даклад у Савнаркоме рабіў старшыня Дзяржпляну БССР т. Гольдбэрг. Выслухаўшы яго даклад, Савнарком канстатаваў, што за мінулы гаспадарчы год рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, дасягнула вялізарнейшых посьпехаў ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, і гэта дае магчымасьць катэгорычна сьцьвярджаць, што пяцігодка ў чатыры гады будзе выканана, а па некаторых галінах мы яе выканаем ў больш кароткі тэрмін.

Агульная продукцыя рэспубліканскай прамысловасьці павялічылася ў другім годзе пяцігодкі на 67,5 проц. і дала рост, у параўнаньні з 1927-28 г на 160 проц. тады, як пяцігадовым плянам быў запроэктаваны плян росту за два гады толькі на 87 проц. Такія вялізарныя посьпехі рабочае клясы, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі.

Рост народнай гаспадаркі ішоў адначасова са значным павялічэньнем кадраў пролетарыяту. Колькасьць рабочых толькі ў адной рэспубліканскай прамысловасьці за 1929-30 г. узрасла больш чым на 14 тысяч чалавек. А колькасьць усіх занятых па найму павялічылася на 40 тысяч чалавек, замест прыросту мінулага году на 20 тысяч чалавек. Дзякуючы гэтаму, мы зусім ліквідавалі беспрацоўе, якое яшчэ параўнальна нядаўна зьяўлялася адной з асноўных проблем народнагаспадарчага пляну.

Мы дасягнулі рашучага павароту бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да колектывізацыі. Роля соцыялістычнага сэктару павялічылася з 5,5 проц. у пачатку 1929-30 г. да 18 проц. к канцу другога году пяцігодкі, у той час як пяцігадовым плянам было намечана да канца пяцігодкі павялічэньне да 18 проц.

Пасьпяховае разьвіцьцё процэсаў аграмадзканьня ў сельскай гаспадарцы абумовіла пераход да ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, прычым наступ па ўсім соцыялістычным фронце ішоў ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і шалёнага супраціўленьня адміраючых клясаў—кулакоў і нэпманаў.

Адначасова Савет Народных Камісараў адзначыў, што ў 1929-30 г. мела месца няпоўнае выкананьне пляну па некаторых паказчыках, асабліва па лініі якасных паказчыкаў і зьніжэньню сабекошту.

Далейшы плян соцыялістычнага наступу

Важнейшыя задачы павінны быць вырашаны ў 1931 годзе. Савнарком намеціў далейшы рост соцыялістычнага сэктару ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, далейшы соцыялістычны наступ па ўсім фронце і рашучае выцясьненьне капіталістычных элемэнтаў, ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі. Савнарком прадугледзеў пытаньне аб палепшаньні ўмоў забясьпечаньня і добрабыту рабочае клясы, прадугледжан значны пералом ва ўсіх групах якасных паказчыкаў работы прамысловасьці, маючы на ўвазе соцыялістычную рэконструкцыю, рацыяналізацыю, максымальнае выкарыстаньне нябачнага ўздыму рабочае клясы і разгортваньне мерапрыемстваў па організацыі працы.

Выкананьне ўсіх задач трэцяга году пяцігодкі патрабуе напружанай работы ўсёй пролетарскай грамадзкасьці, гаспадарчых органаў, профсаюзных організацый і далейшага разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўных фактараў для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Савнарком намеціў рост рэспубліканскай прамысловасьці, якая непасрэдна знаходзіцца пад ведамам ВСНГБ (бяз лесаб'яднаньняў), у 1931 годзе з 284,5 млн. рублёў да 581,9 млн. рублёў, альбо на 104,5 проц.

Рост сярэднягадовай колькасьці рабочых у рэспубліканскай прамысловасьці (бяз лесаб'яднаньняў) Савнаркомам вызначан з 42,9 тысяч чалавек у 1930 г. да 65,6 тысяч чалавек у 1931 годзе, альбо на 59,8 проц., а рост вытворчасьці працы—на 30,4 проц. Рост сярэднягадовай зарплаты па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці вызначан у грашовым выразе на 5,2 проц.

Зьніжэньне сабекошту на 1931 год вызначана па рэспубліканскай прамысловасьці на 10 проц. пры абавязковай умове палепшаньня якасьці продукцыі. СНК паставіў задачу перад рэспубліканскай прамысловасьцю ахапіць бесьперапыннай да канца 1931 году ўсіх рабочых, а сямігадзінным рабочым днём—да 95 проц. рабочых, замест 42,8 проц.

Капітальнае будаўніцтва ў рэспубліканскай прамысловасьці вызначана ў суме 109,5 млн. рублёў. З гэтай сумы 15,3 млн. рублёў—на жыльлёвае будаўніцтва і 4,4 млн. руб.—на соцыяльна-бытавое будаўніцва.

Значна расьце па пляну лік членаў прамысловых арцеляй—коопэрацыі—з 26,7 тысяч чалавек у 1930 г. да 57,9 тыс. чалавек у 1931 г.

СНК вызначыў давесьці да 1-га студзеня 1932 г. размеры колектывізацыі да 45 проц. агульнай колькасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР.

Агульная пасеўная плошча прынята на 1931 год у размеры 4083 тыс. га. Пасеўная плошча трэставаных савецкіх гаспадарак павінна быць даведзена к вясьне 1931 году з 57 тысяч га да 135,5 тысяч га.

Павялічваецца колькасьць галоў буйнае рагатае жывёлы на 26,6 проц., сьвіней — на 50 проц. Для пашырэньня колькасьці стад і іх таварнасьці ў спэцыялізаваных прыгародных малочных колгасах павінна быць ня менш 27 тысяч кароў к 1-му студзеня 1932 году.

Савнарком БССР прызнаў неабходным разгарнуць на сродкі мясцовага бюджэту сеткі школ з такім разьлікам, каб ахапіць імі 575 тысяч дзяцей.

Школамі другога концэнтру з студзеня павінна быць ахоплена ня менш 2 тысяч дзяцей, а з верасьня лік вучняў даводзіцца да 108 тысяч. Павінны быць прыцягнуты да абавязковага навучаньня ў пятай групе ўсе скончыўшыя пачатковую школу дзеці рабочых ва ўзросьце 12-14 год. За лік сродкаў, вызначаных па кантрольных лічбах на дапамогу беднаце, павінны быць організаваны пры школах для дзяцей рабочых, бедняты, батракоў і колгасьнікаў інтэрнаты з такім разьлікам, каб у кожным раёне было ня менш адной школы з інтэрнатам.

У галіне электрыфікацыі Асінбуду даручана весьці работу па будаўніцтву другой чаргі электрычнай станцыі такім чынам, каб турбіна магутнасьцю ў 24 тыс. кілёват магла быць пушчана не пазьней, чым у пачатку кастрычніка 1931 году.

Савнарком БССР лічыць, што задача далейшай колектывізацыі вёскі зьяўляецца асноўнай задачай у справе соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, а таму даручыў Наркамзему, Белколгасцэнтру і шэрагу іншых організацый з усёй энэргіяй разгарнуць работу па пашырэньню колгаснага руху.

Прапанавана палепшыць у 1931 годзе тавараннае забясьпечаньне рабочых, выканаць усе ліміты па стварэньню прыгародных гаспадарак.

Савнарком лічыць неабходным, каб Наркамасьветы забясьпечыў удзел пролетарскай грамадзкасьці ў справе разьвіцьця культурнай рэволюцыі.

Намечан колёсальны рост ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва, забясьпечан далейшы пераможны ход культурнай рэволюцыі. Выкананьне пляну соцыялістычнага будаўніцтва на 1931 год павінна быць забясьпечана самым шырокім удзелам у плянавай рабоце ўсяе рабочае клясы, усіх працоўных. Дзеля гэтага ўсім гаспадарчым організацыям і профсаюзам неабходна неадкладна правесьці работу па давядзеньню кантрольных лічбаў да рабочых прадпрыемстваў, саўгасаў і колгасьнікаў і забясьпечыць складаньне бальшавіцкіх сустрэчных прамфінпляпаў.

Прэч з дарогі!



Ніякія опортуністычныя вылазкі ня спыняць пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне

Сустрэчным прамфінплянам—насустрач 3-му году пяцігодкі

Рабочыя чырвонаштандартнага заводу „Бальшавік" прыступілі да с… даньня сустрэчнага прамфінпляну … 1931 год.

Кожны рабочы, кожная ўдарн… брыгада, з лёзунгам: „бальшав… прамфінплян—ад варштата да Дз… пляну", дэталёва абгаварылі на … вых сходах рабочых, на сходах … рых рабочых, рабкораў, комсам… цаў, жанчын і інш. Кожная бры… вывучыўшы ўсе магчымасьці св… варштата, сілу сваёй брыгады, па… ла сваю програму выпрацоўкі су… існуючых норм на 30 проц.

Вытворчая програма хромавага … ху павялічваецца на 25 проц., … ворчасьць працы па некаторых … галах падымаецца на 33 проц.

У лаечным цэху вытворчая пр… ма на сустрэчнаму прамфінпляну … дымаецца на 7,14 пр. супроць на… нага пляну.

Вытворчасьць працы па бры… павялічваецца на 28,4 проц. Пр… раводзе зольных работ на га… золку вытворчасьць працы пады… ца ня 100 проц. Рабочыя ўнесьлі … раг каштоўных прапаноў.

Па шэрстамыйцы і пральні вы… чая програма па 1931 год уста… ваецца ў 634 тоны, работа пады… па на 25 проц. супроць ударнага … талу. Брыгада прачак падымае вытворчасьць на 60 проц.

У жэлаціновым цэху, па высу… самімі рабочымі брыгадамі пры… працоўцы прамфінпляну на … програме, вытворчасьць працы … маецца на 11,9 проц. Брыгада … шчыкаў падняла вытворчасьць … на 18 проц. Брыгада рэзкі і ра… кі падымае на 11 проц. Брыгада … сароў гэтага цэху бярэцца … рамантаваць вагапеткі, рэзальную … шыну і паправіць краны, каб ня … ўцечкі клею. Брыгада выпарш… бярэ шэфства над машынамі.

Мэханічны цэх лічыцца сэр… заводу. Брыгада гэтага цэху ведае … ад своечасовага адрамантаваньня … шын залежыць выкананьне пра… пляну. Яна па-бальшавіцку распр… вае свой сустрэчны прамфін… бярэцца падняць вытворчасьць … на 8,5 проц., устанавіўшы пяни… монту машын па заводзе, чаго … ло да гэтага часу.

Брыгада электрамантэраў бяр… сябе абавязацельства выкарыста… рыя маторы, провады і г. д. і ў… шэраг каштоўных прапаноў: уст… віць у артэзіянск. студні вакуум … для павялічэньня падачы вады, … біць запасныя часткі для машын … менш было прастояў.

Пры прапрацоўцы сустрэчнага … фінпляну рабочыя ўнесьлі каля … рацыяналізатарскіх прапаноў, якія … дуць заводу не адну тысячу ру… эканоміі.

Ня ўпушчаны таксама пытан… аб якасьці продукцыі. Брыгада … галёў зьніжае брак з 2 да 1 … Брыгада ласільшчыкаў зьніжае … з 5 да 0 проц. Брыгада шпрыц… ту, набіўшчыкі таксама зусім … шчаюць брак.

Мы ўпэўнены, што з такім … язмам, з якім рабочыя распра… свой сустрэчны плян па брыга… будзе і выканан, а гэта будзе … лепшым адказам усім малаверам з … вага і „левага" лягеру, шкодн… ўсім тым, хто хоча пашкодзіць … му пасьпяховаму будаўніцтву.

Мінь…

Прамфінплян ня выканан

Становішча з выкананьнем прамфінпляну на заводзе „Энэргія" (Менск) даволі трывожнае. Прамфінплян за кастрычнік выканан толькі на 96,49 проц., процант браку ня зьніжан, а наадварот—павысіўся да 10,7 проц. Галоўныя прычыны: недахоп рабочай сілы і слабая кваліфікацыя некаторай часткі рабочых заводу.

Зусім слаба ўвязана праца паміж цэхамі, што стварае вялікія праблемы. Недастаткова пастаўлена плянаваньне. Загэтым чыгунна-ліцейны цэх на 10 проц павысіў свой брак, тады як плянам намечана зьменшыць брак да 5 проц.

Рабочыя заводу „Энэргія" не мобілізаваны на ліквідацыю прарываў і выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу. Ударныя брыгады слаба паставілі сваю працу.

Скразныя брыгады існуюць толькі на паперы, бо ніякай працы імі не праводзіцца. Толькі комсамольская брыгада сьвідравальшчыкаў-варштатаў за час Фрунзэўскай раённай конфэрэнцыі ЛКСМБ узялася за ліквідацыю прарыву цэху.

Андрэ…

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ У РАБОЦЕ

У Гомельскім вясковым раёне накіравалі самакрытыку ў бестэрміновы адпачынак

„ЗАСІЛОСАВАНАЯ“ САМАКРЫТЫКА

Калі закрылася комсамольская конфэрэнцыя ў Гомельскім вясковым райкоме, бюро райкому партыі адзначыла ў сваёй пастанове, што конфэрэнцыя комсамолу прайшла на аснове шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі.

Пастанову запісалі ў пратакол пасяджэньня бюро Гомельскага вясковага райкому КП(б)Б, прычым маўчалі аб паўторным правядзеньні райконфэрэнцыі комсамолу і аб выводзінах на конфэрэнцыі работніка РК КП(б)Б Усэвіча. Не запісалі і таго, што замест партыйнага кіраўніцтва на конфэрэнцыі было пустое месца.

Як быццам усё добра. І самакрытыка была і конфэрэнцыя прайшла.

Ці варта гаварыць аб дробязях?

Ну што з таго, што Усэвіч—масавы работнік РК партыі, перакінуты з працы сэкратара райкому КП(б)Б толькі за 16 дзён да конфэрэнцыі—адмовіўся зрабіць на конфэрэнцыі справаздачу райкому КСМ.

Калі да сэкратара РК партыі т. Анішчанка прышоў новы сэкратар РК КСМ Камісарчык з пастановай бюро РК, каб прымусіць Усэвіча рабіць справаздачу, Анішчанка глыбокадумна разьвёў рукамі і сказаў: „Не жадае, ну і ня трэба“.

А Усэвіч, азнаёміўшыся з матэрыяламі дакладу, заявіў Камісарчыку: „Ты мне ўхілы хочаш прыпісаць, усё роўна нічога ня будзе“.

Мы ня зьбіраемся прыпісваць што-небудзь тав. Усэвічу. Мы дамо толькі слова фактам.

Ухілаў здаецца ня было(?!) Вось толькі райком з гонарам... непрапрацаваў у комсамольскай арганізацыі Усебеларускай адозвы ЦК партыі і ЛКСМ аб сустрэчы 3-га году пяцігодкі.

Можа таму, што на вытворчасьці ўсё добра. Але ў цагельнях прарыў за прарывам. Комсамольцаў ва ўдарных брыгадах можна не разуваючыся па пальцах пералічыць.

А рэкордсмэны, у вытворчасьці хто?—Комсамольцы! Але рэкорды прагульныя—па 14 прагулаў у месяц ухітраюцца зрабіць.

А ў колгасах 35—40 проц. вясковых комсамольцаў.

Усеабуч?—Аб ім, здаецца, нешта пісалі. Але прычым тут комсамол.

16-ты зьезд УсеКП(б) адбываўся ў Маскве, XIII КП(б)Б—у Менску, дык ці варта ў Гомельскай вясковай комсамольскай організацыі прапрацоўваць рашэньні зьездаў?

Вялікадзяржаўны расійскі шовінізм—галоўная небясьпека на даным этапе, як і контррэволюцыйны нацдэмократызм і шовінізмы ўсіх колераў. Аб гэтым ведаў РК, але палец аб палец ня вытнуў, каб мобілізаваць раённую організацыю комсамолу на барацьбу за ленінскую нацыянальную політыку.

Райком ведае і аб тым, што актыў ячэек выступае з анты-колгаснай агітацыяй і рэгіструе, што ўвогуле ўсё добра.

Колгасна-вытворчы паход і жывёлагадоўля праводзіцца пасьпяхова толькі ў рэзолюцыях і пастановах. Сілосная маса замарынавана ў цыркулярах, а ямы пад сілос вырыты толькі ў прамовах і дакладах.

Ну, а як самакрытыка? Яна была прадбачана плянамі работы РК, нават у каляндарніку аб самакрытыцы запісалі. Відаць засілосавалі яе замест сілоснай масы, бо на конфэрэнцыі ўсё было ціха, і толькі 9 чалавек выступіла ў спрэчках па дакладу РК.

Ды і на конфэрэнцыю з 140 дэлегатаў зьявілася толькі—67.

Праўда, здарыўся адзін няпрыемны факт. Сакратар РК—Камісарчык выступіў з прамовай, якая ўзьняла завесу над аліл‑йнымі рэзолюцыямі. Ён адразу-ж атрымаў ад Усэвіча пісульку:—„Лічу, што падпальваць нельга, аб гэтым можна будзе пагаварыць там дзе трэба“.

Усэвіч наміняў на райком партыі, партыкіраўніцтва якога выразілася ў тым, што культпроп РК зрабіўшы політдаклад, больш на конфэрэнцыю не зьвіўляўся, як і ніхто з сяброў бюро РК...

Калі закрылася конфэрэнцыя Гомельскага вясковага райкому, Бюро РК КП(б) вынесла пастанову, у якой адзначыла...

Да гэтай пастановы мы хочам дадаць пару маленькіх паправак. Там, дзе гаворыцца наконт шырока разгорнутай самакрытыкі, дадаць: „замест самакрытыкі было пустое месца“.

Просім ЦК КП(б)Б зацікавіцца нораламі партыкіраўніцтва Гомельскага вясковага райкому КП(б)Б.

Гомельскую вясковую комсамольскую організацыю неабходна ажывіць сьвежым паветрам самакрытыкі.

А.

Агонь па падкулачніках

З 25 па 26 кастрычніка праходзіла раённая конфэрэнцыя КСМ Мурыдзенскага раёну.

У спрэчках па справаздачы РК КСМ конфэрэнцыя адзначыла, што некаторыя сэкратары ячэек з прычыны дрэннага кіраўніцтва РК, блёкаваліся з кулаком.

Факты: Сэкратар Целякаўскай ячэйкі—Рыжкова мела сувязь з кулаком, хадзіла да яго ў хату, вязала яму з воўны хусткі, панчохі і рукавіцы. Сэкратар Нівоўскай ячэйкі Трусаў выступіў на сходзе сялян супроць хлебазагатовак.

У Лашанскай ячэйцы КСМ комсамольцы-серадніакі, якія плоцяць па 90 рублёў падатку, ідуць супроць колектывізацыі, нарыхтовак і дагэтуль трымаюцца ў КСМ.

Сэкратар Целяўскага с-с—комсамолка Барысэвіч Гэнька, у час вялікадня ўсё сьвята ня выходзіла ў сельсавет на працу і недзе прападала.

Колгасьнік.

„Сьвінагадоўля—справа толькі колгасаў...“

З вялікім спазьненьнем Пухавіцкая комсамольская організацыя ўключылася ў правядзеньне сьвінагадоўчай эстафэты. Толькі 20 кастрычніка на пленуме РК КСМ было разгледжана гэта пытаньне і намечаны мерапрыемствы ў практычнай працы комсамольскіх ячэек. Але ніводная з ячэек да гэтага часу ня прыступіла да працы. Многія комсамольскія ячэйкі лічаць сябе не да твару займацца „сьвінымі справамі“.

Сэкратар Гарэліцкай ячэйкі ЛКСМБ лічыць, што сьвінагадоўля—„ня наша справа, а толькі колгасу, дык няхай колгас і займаецца ёю!“ Таксама і райком ЛКСМБ да сьвінагадоўлі аднёсься формальна, бюрократычна, даў толькі заданьне ячэйкам, вынес прыгожыя рэзолюцыі і цяпер спакойны.

Райком практычна не дапамагаў ячэйкам, не праверыў іх працу, і ня даў рашучага адпору права опортуністычным разважаньням некаторых актывістых — сэкратароў ячэек, быццам „справа сьвінагадоўлі—не комсамольская справа“.

Боська.

За ўдарныя тэмпы

Лепельская райорганізацыя ЛКСМБ прышла да 10 раённай конфэрэнцыі з рашучым пераломам, які наметаўся ў апошнія часы, да пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва.

Рост колгасаў у раёне і організацыя новых, 26 проц. колектывізацыі ў раёне, атрады агітатараў за колгас, высоўваньне комсамольскімі ячэйкамі сустрэчных колгасных плянаў, работа груп плянавікоў, актыўны ўдзел шэрагу ячэек у бульба і хлебазагатоўках значна павысілі аўторытэт комсамолу сярод колгасьнікаў і працоўных раёну.

Разам з тым, многія ячэйкі ў сваёй практычнай рабоце дапусьцілі шэраг як правоопортуністычную практыку так і „лявацкіх“ заскокаў. У Пышнянскай ячэйцы ў час самаабкладаньня зусім не знашлося кулакоў. А калі райком КСМ ускалыхнуў ячэйку, дык паасобныя комсамольцы прапанавалі абкласьці індывідуальна да 45 проц. насельніцтва.

У організацыі былі факты дэзэртырства комсамольцаў як з колгасаў, так і з капальняў Донбасу. У некаторай частцы гарадзкіх ячэек (БПТ, коопэрацыйная) паасобныя комсамольцы прымірэнча адносіліся да гэтых праяў, адкрыта выступаючы ў абарону дэзэртыраў.



Ударніца

Ляхавіцкая, Забароўская і Стайская ячэйкі зусім стаялі ў баку ад колгаснага будаўніцтва і ад работы па ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі. Райком комсамолу своечасова і рашуча ўдарыў па праявах правоопортуністычнай практыкі гэтых ячэек, распусьціўшы бюро і правёўшы шэраг мерапрыемстваў. Сэкратары Ляхаўскай, Забароўскай і Стайскай ячэек былі выключаны з шэрагаў КСМ.

З абраных на конфэрэнцыю 107 дэлегатаў зьявілася 96. Райком правёў падрыхтоўчую працу да райконфэрэнцыі і зьездаў (організацыя сустрэчнага пляну па раёне і асобных ячэйках, наскараньня тэмпаў колгасна-вытворчага паходу, асобная праца з дэлегатамі райконфэрэнцыі).

Райконфэрэнцыя ў сваіх пастановах высунула на абгаварэньне ўсебеларускага зьезду ЛКСМБ прапановы: 1) організацыя ў раёнах вячэрніх колгасных тэхнікумаў для комсамольцаў і моладзі з тым, каб рыхтаваць кадры для колгасаў, 2) організацыя завочнага агра-колгаснага тэхнікуму з сеткай консультантаў у раёнах.

У парадку падрыхтоўкі да 9 зьезду УсеЛКСМ і 10 ЛКСМБ конфэрэнцыя пастанавіла організаваць сіламі комсамольскіх ячэек два колгасы імя зьездаў.

Улічваючы, што зяблівая ўзорка знаходзіцца пад пагрозай зрыву, конфэрэнцыя абвясьціла ўсю раённую організацыю ЛКСМБ мобілізаванай на работу па ліквідацыі прарываў па зяблівай узорцы і перавыкананьню плянаў па бульба і хлебазагатоўках.

У спрэчках па дакладу РК выказалася 24 чалавекі. [illegible] выступленьнях яны падпарадкавалі жорсткай крытыцы факты адхіленьняў у практычнай рабоце ад генэральнай лініі партыі ў паасобных зьвеньнях організацыі.

Пост „Чырвонай Зьмены“

КАРАСЬ, КАМЕНКА.

ВОН З ЛЕНІНСКОЙ ПАРТЫІ

Выканаем пяцігодку ў 4 гады—вось наш адказ права-„лявацкім“ фіглярам

Бязьлітасна змагацца на два франты!

(З рэзолюцыі агульнага сходу комсамольскага актыву гораду Гомелю аб фракцыйных дзеяньнях Сырцова, Шацкіна і інш.).

Комсамольскі актыў горача вітае пастанову ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з шэрагаў партыі Рупіна, Нусінава, Каврайскага і Сьляпкова, якія імкнуліся ў саюзе з контррэволюцыйным троцкізмам сарваць генэральную лінію партыі, давер'е шырокіх мас рабочае клясы да партыі, да ле ленінскага ЦК.

Комсамольскі актыў асуджае правоопортуністычнае выступленьне Мінаева і Бутыркіна, меўшае месца ў ленінградзкай організацыі, іх хлусьню ў абвінавачваньні комсамолу ў „крызісе актыўнасьці“, „адсутнасьці актыўнасьці“ і аналёгічнае правоопортуністычнае выступленьне ў Беларусі на апошнім Пленуме ЦК ЛКСМБ сэкратара Горацкага РК Целешава.

Актыў патрабуе ад былых лідэраў правага ўхілу і асабліва ад тав. Бухарына, які да гэтага часу ня прызнаў перад усёй партыяй сваіх правоопортуністычных памылак, адкрытага адказу аб сваіх адносінах да пастаноў XVI зьезду і да правага ўхілу, які зараз змыкаецца з контррэволюцыйным троцкізмам.

Комсамольскі актыў ухваляе рашучыя меры ЦК і ЦКК УсеКП(б) у адносінах да двурушнікаў—здраднікаў і лічыць, што ЦК і ЦКК УсеКП(б) павінны прыняць усе захады аж да выключэньня з шэрагаў партыі Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна і інш., стаўшых на шлях падпольнай барацьбы супроць партыі.

Патрабуем ад усёй організацыі яшчэ большай напружанасьці і праяўленьня комсамольскага энтузіязму да выкананьня опэрацыйнага пляну гэтага ўдарнага кварталу і пяцігодкі ў 4 гады.

Комсамольскі актыў рашуча патрабуе ад усёй комсамольскай організацыі ўзброіць сябе ведам нацполітыкі партыі, беларускай мовай у барацьбе з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай у даны момант, нацдэмократызмам і шовінізмамі розных колераў.

Актыў заклікае ўсю організацыю да рашучай бязьлітаснай барацьбы на два фронты: з правым опортунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і „левымі“ наскокамі—рэцыдывам к троцкізму.

Актыў прапануе ўсім комсамольскім ячэйкам на чарговых сабраньнях днёх прапрацаваць вынікі пленуму, разгарнуўшы шырокую растлумачальную працу аб задачах нацыянальнай політыкі партыі, аб сутнасьці вялікадзяржаўнага шовінізму, нацдэмократызму і шовінізмаў іншых колераў.

Бальшавіцкімі тэмпамі працы і шырокай самакрытыкай забясьпечым выкананьне пяцігодкі ў 4 гады. Правільнай нацыянальнай політыкай узмацнім фронт нацкультурнага будаўніцтва, зьнішчым рэшткі нацыянальнай няроўнасьці, забясьпечым перамогу соцыялізму на ўсім фронце.

Няхай жыве ленінскае адзінства партыі, ле штаб ЦК і ленінскі вучань Леніна—т. Сталін.

Ужыць рашэньні XVI зьезду

(З рэзолюцыі бюро Фрунзэнскага РК ЛКСМБ сумесна з сэкратарамі комсамольскіх колектываў і ячэек)

Бюро ФРК ЛКСМБ, сумесна з сэкратарамі колектываў, ухваляе рашэньне політбюро ЦК УсеКП(б) аб вывадзе Сырцова са складу ЦК і Шацкіна са складу ЦКК і просіць вышэйшыя парторганы прымяніць да ўсіх правых опортуністых, якія працягваюць барацьбу супроць партыі, рашэньні 16 партзьезду аб несумяшчальнасьці поглядаў правага опортунізму з прабываньнем у шэрагах партыі.

Бюро ФРК і нарада пастанавілі правесьці зачыненыя сходы комсамольскіх колектываў і ячэек па пытаньню ўнутрыпартыйнага становішча і аб рашэньнях пленуму ЦК КП(б)Б для таго, каб яшчэ больш згуртавацца вакол компартыі на выкананьне яе генэральнай лініі.

Бюро Фрунзэўскага РК ЛКСМБ, сумесна з сэкратарамі колектываў і ячэек, заклікае ўсю комсамольскую організацыю на правядзеньне яшчэ большай і бязьлітаснай барацьбы з правымі правага опортунізму, з „левымі“ загібамі і прымірэнчымі ад осінамі да іх, для яшчэ больш энэргічнага ўдзелу ў справе разгортваньня бальшавіцкіх тэмпаў, ударніцкага руху, на выкананьне і перавыкананьне пляну ўдарнага кварталу, на забясьпечаньне выкананьня і перавыкананьня 3 рашаючага году пяцігодкі.

Бюро РК, сумесна з нарадай сэкратароў колектываў і ячэек ЛКСМБ, ад імя ўсяго комсамолу Фрунзэўкі выказвае цьвёрдую і непахісную пэўнасьць у тым, што комсамол Фрунзэўкі і надалей будзе цьвёрда змагацца за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьне задач будаўніцтва соцыялізму.

Патрабуем самых рашучых мер

(З рэзолюцыі пленуму Ленінградзкага абкому УсеЛКСМ)

Пленум Ленінградзкага абласнога камітэту УсеЛКСМ настойвае перад ЦК УсеКП(б) і ЦКК на прыняцьці ў адносінах да двурушнікаў-фракцыянэраў Сырцова, Ламінадзэ, Шацкіна і інш. самых рашучых мер аж да выключэньня з партыі. Пленум вітае рашэньні ЦКК аб выключэньні з шэрагаў УсеКП(б) двурушнікаў-здраднікаў Рупіна, Нусінава, Каврайскага і рашэньні парт. органаў аб выключэньні з партыі Сьляпкова і Марэцкага.

Маўчаньне лідэраў і ідэолёгаў правага ўхілу—Бухарына, Рыкава і Томскага—расцэньваецца намі, як захаванае падтрыманьне сваіх правых поглядаў, падтрыманьне двурушніцтва, як тактыка захаванай барацьбы супроць лініі партыі.

Пленум Ленінградзкага абкому УсеЛКСМ з усёй рашучасьцю асуджае маўчаньне т.т. Бухарына, Рыкава і Томскага і патрабуе безумоўнага выкананьня рашэньняў XVI зьезду партыі.

Правоопортуністычным вылазкам Мінаева і Бутыркіна, якія зьяўляюцца рупарам кулацкіх настрояў у комсамоле, якія імкнуцца рабіць паклёпы на саюз і рэвізаваць яго лінію, „тэорэтычна“ абгрунтоўваючы сваю правоопортуністычную пазгоднасьць з лініяй саюзу і партыі, Ленінградзкі комсамол даў сакрушальны адпор. Ленінградзкая організацыя УсеЛКСМ была, ёсьць і будзе верным дапаможнікам і апло там партыі ў барацьбе за генэральную ленінскую лінію.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

ЗАМЕСТ ХЛЕБА—ВОЛАВА

ЛЁНДАН, 15. Як паведамляюць з Бомбэю, у Джалампуры (Бэнгалія) адбылася сур'ёзная сутычка паміж чыгуначнікамі і паліцыяй. Протэстуючы супроць нядаўнага павышэньня цэн на харчы, чыгуначнікі разбурылі крамы, закідаючы камяньнямі паліцыю, якая імкнулася іх разагнаць. Многа рабочых арыштавана. Натоўп накіраваўся да турмы, каб вызваліць затрыманых рабочых. Паліцыя адкрыла агонь. Забіты 4 і паранены 19 дэманстрантаў.

Мізэрны прадлог для маскіроўкі вайны

ПАРЫЖ. Як паведамляюць з Брусэлю, орган бэльгійскай соцыялістычнай партыі „Пэпль“ у артыкуле аб уяўным савецкім „дэмпінгу“ піша: „зусім відавочна, што так званы савецкі дэмпінг зьяўляецца толькі мізэрным прадлогам для маскоўкі падрыхтоўкі вайны супроць Савецкай Расіі“. Адмежаваўшыся ад кампаніі, накіраванай супроць савецкага ўвозу, „Пэпль“ бязумоўна дзейнічаў пад уплывам той трывогі, якая ахапіла бэльгійскіх прамыслоўцаў у сувязі з контрмерамі савецкага ўраду. Сказаўся і націск з боку сымпатызуючых СССР рабочых, радавых членаў соцыялісты най партыі.

Паказальная перамога компартыі

ЛЁНДАН, Ангельская компартыя выйграла 2 мандаты на муніцыпальных выбарах у Шотляндыі. Аса ліва паказальна перамога компартыі ў Порт-Глязго, дзе за камуністычнага кандыдата Маклача падала 1.050 галасоў, а за кандыдата рабочай партыі 337 галасоў.

Нэрвовы настрой пілсудчыкаў

Армія і паліцыя падтрымліваюць парадак

ВАРШАВА, 15. Па меры набліжэньня рашаючага дня выбараў у сойм прыкметна пасільваецца нэрвовы настрой сярод пілсудчыкаў, якія, ня гледзячы на ўсе прынятыя захады, усё-ж баяцца, што іх націск будзе невыстарчальным і што ім не давядзецца правесьці неабходную колькасьць мандатаў.

У сувязі з усімі гэтымі апаскамі за апошнія дні агітацыйныя мэтады пілсудчыкаў становяцца з кожнай гадзінай усё больш і больш бесцарамоннымі і цынічнымі.

Так, адзін з дэмократычных дзеячоў, перашоўшы ў лягер пілсудчыкаў, апублікаваў адозву сваім былым таварышом па партыі, у якой даводзіць, што пілсудчыкі ажыцьцяўляюць нацыянал - дэмократычную програму больш рашуча і цьвёрда, чым самі нацыянал-дэмократы. У адозьве гаворыцца, што „ўціхамірваньне“ Заходняй Украіны праведзена пілсудчыкамі ў такой ступені, што „нашым таварышом нацыянал-дэмократам ва Львове застаецца толькі радавацца“. Украінцы,—гаворыцца ў адозьве,—зьніклі, засталіся толькі русіны, зусім як у часы графа Бобрынскага (царскі намесьнік усходняй Галіцыі). Украінскія школы зьнікаюць, ва ўкраінскіх каапэратывах адабраны таварныя лішкі, зьнішчаны нэрвуючыя палякаў украінскія надпісы, армія і паліцыя падтрымліваюць парадак. Далей адзначаецца, што другая нацменшасьць, з якою нацыянал-дэмократычныя дзеячы ня здолелі справіцца, гэта беларусы. Але з імі расквіталіся пілсудчыкі. Яшчэ ў час тутэйшага сойму ўсе беларускія дэпутаты былі пасаджаны пілсудчыкамі ў турму. Ня думайце,—указваецца ў адозьве,—што да яўрэяў асабліва ласкавы беспартыйны блёк. Памятайце, што ўведзены царскім урадам дэкрэт аб ануляваньні аграабмежаваньня праў яўрэяў да гэтага часу ня выдан. Нацыянал-дэмократычная партыя цяпер стала непатрэбнай,—гаворыцца ў адозьве,—пераходзьце масамі ў беспартыйны блёк“.

Сэсыль задумаў шырокі манэўр

ЖЭНЭВА, 14. На сэсіі падрыхтоўчай камісіі да конфэрэнцыі па разбраеньню працягваліся спрэчкі па пытаньню аб абмежаваньнях ваенных матар'ялаў.

Італьянскі дэлегат Марыніс ізноў выказаўся за прымяненьне як простага скарочаньня ваенных матар'ялаў, так і адпаведнага скарачаньня бюджэту і ўнёс прапанову, якая мала чым адрозьніваецца ад прапановы, унесенай па гэтаму пытаньню савецкай дэлегацыяй. Кіраўнік савецкай дэлегацыі тав. Літвінаў прапанаваў прагаласаваць спачатку савецкую прапанову, як найбольш радыкальную (прапанова прадугледжвае поўнае і адначаснае прымяненьне абодвых мэтадаў), а потым ужо асобна прагаласаваць пытаньне аб мэтазгоднасьці першага і другога мэтадаў.

Затым выступіў з прамовамі цэлы шэраг прамоўцаў. Увесь сэнс іх выступленьняў зводзіўся да жаданьня пазьбегнуць простага галасаваньня якое прапанаваў тав. Літвінаў. Адказваючы бэльгійскаму дэлегату Курцэ-у, які выказаўся за бюджэтнае скарачэньне з прычыны „прастаты“ гэтага мэтаду тав. Літвінаў указаў, што „прастата обратно-пропорцыянальна разбраеньню“ і што прасьцей за ўсё было-б зусім не зачэпліваць пытаньняў аб узбраеньні. „Чым больш элемэнтаў скарочаньня, заявіў Літвінаў,—будзе ўведзена ў конвэнцыю, тым менш будзе „прастаты“. „Бэльгійскі дэлегат,—працягвае тав. Літвінаў,—выказваецца супроць простага скарочаньня ваенных матар'ялаў, быццам таму, што ён ня ведае як дасканала, што іменна падпарадкуецца скарочаньню. Я-ж супроць бюджэтнага скарочаньня, бо ведаю, што пры гэтым мэтадзе ня будуць падпарадкаваны скарочаньню існуючыя велізарныя запасы ваенных матар'ялаў.

Адбываецца паіменнае галасаваньне.

За савецкую прапанову галасуюць СССР, Нямеччына, Італія, Турцыя, Голяндыя. Супроць—12 дэлегацый, уключаючы Ангельшчыну, Францыю, Злучаныя Штаты, Японію Фінляндыю Польшчу, Румынію і інш.

За італьянскую прапанову галасуюць Нямеччына, СССР, Італія, Турцыя, Голяндыя, Вэнэцуэла, Ірляндыя, Канада і Швэцыя, супроць—11.

За нямецкую прапанову аб прымяненьні простага мэтаду абмежаваньня ваенных матар'ялаў галасуюць—Нямеччына, СССР, Італія, Амэрыканскія Штаты, Турцыя, Голяндыя, Вэнэцуэла, Канада. Швэцыя, Грэцыя. Супроць галасуюць—9 дэлегацый. Устрымаўшыхся—7, у тым ліку Ангельшчына. У выніку гэтага галасаваньня нямецкая прапанова адхіляецца.

Далей галасуецца троху зьменены тэкст учарайшай ангельскай прапановы, якая адзначае, што „большасьць дэлегацый выказваецца за бюджэтнае абмежаваньне, тады як частка—за простае абмежаваньне, а другая частка за камбінаванае прымяненьне абодвых мэтадаў“. Ангельская прапанова прымаецца большасьцю 16 супроць 3-х (СССР, Нямеччына, Італія,) пры 2 устрымаўшыхся. у ліку ўстрымаўшыхся Турцыя і Амэрыканскія Злучаныя Штаты. У выніку трохдзённых спрэчак, задуманы Сэсылем шырокі манэўр, якім ён хацеў пазбавіцца сябе ад неабходнасьці галасаваць па асобных прапановах, праваліўся. Цікава, што Канада і Ірляндыя ў большасьці выпадкаў галасавалі супроць Ангельшчыны.

Сьвяткаваньне XIII гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі ў Бэрліне



Сьвяткаваньне XIII гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі прашло ў Бэрліне пры ўдзеле шырокіх пластоў насельніцтва. У Бэрліне ва ўсіх раёнах адбыліся шматлюдныя ўрачыстыя сходы і дэмонстрацыі. Усе сходы і дэмонстрацыі праходзілі пад лёзунгам абароны Савецкага Саюзу і барацьбы за Савецкую Нямеччыну. Адбыліся сутычкі з паліцыяй.

НА ЗДЫМКУ: Ня гледзячы на лівень, „Чырвоны Вэдынг“ дэмонструе.

На чале дэмонстрацыі ішлі комсамольцы.

Польскі фашызм на „выбарах“

Паліцыя прыведзена ў баявую гатоўнасьць

ВАРШАВА, 15. На заўтра назначаны выбары ў польскі парлямант. У сувязі з гэтым прыведзена ў баявую гатоўнасьць уся паліцыя. Прадвыбарны паліцэйскі тэрор у самым разгары. У адной Варшаве на працягу апошніх двух дзён арыштавана каля 250 рабочых, зачынена 6 рэволюцыйных профсаюзных організацый, канфіскавана вялікая колькасьць прадвыбарнай літаратуры, выпушчанай прыхільнікамі рэволюцыйнага сьпісу рабоча-сялянскага адзінства. Масавыя арышты рабочых праведзены таксама ў Дамброўскім каменавугальным раёне, Верхняй Сілезіі і інш. прамысловых акругах Польшчы.

Жорсткі паліцэйскі тэрор, накіраваны ў першую чаргу супроць рэволюцыйнага пролетарыяту, з меншай сілай, але ўсё-ж захоплівае і соцыялістых (меншавікоў) і тыя буржуазныя партыі, якія прыкідваюцца „працаўнікамі“ сучаснага фашысцкага ўраду Польшчы. Цікава адзначыць, што ўчора ў Варшаву прыбылі соцыялістычныя дэпутаты францускага парляманту Лёкен і Віле, а таксама правадыр францускіх згодніцкіх профсаюзаў Жуо. Зусім бясспрэчна, што яны будуць імкнуцца ўтварыць поўны націск на польскі ўрад з мэтаю паслабіць прадвыбарныя прасьледваньні польскіх соцыял-фашыстых.

Аднак, ня гледзячы на тэрор, фашысцкі ўрад усё-ж апасаецца, што нават з дапамогаю паліцэйскіх гвалтаў і ўсякага роду ашуканскіх махінацый яму ня ўдасца забясьпечыць сваім прыхільнікам большасьць у новым парляманце. Урад таму імкнецца зараз перацягнуць на свой бок як мага болей буржуазных выбаршчыкаў, спакушаючы іх расьпісваньнем сваіх „посьпехаў“ на барацьбе з рэволюцыйным рухам.

АБ АДТЭРМІНАВАНЬНІ СКЛІКАНЬНЯ 3-Й СЭСІІ ЦВК БССР IX-ГА СКЛІКАНЬНЯ

У сувязку з неабходнасьцю правядзеньня падрыхтовак, у прыватнасьці, сканчэньня бульбапарыхтовак, Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў перанесьці скліканьне 3-й Сэсіі ЦВК БССР IX-га скліканьня на 28-е лістапада 1930 г.

Сакратар ЦВК БССР А Хацкевіч.

З ФРОНТУ КОЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

У Старадарожскім раёне за час уборкі і асеньняй сяўбы з'арганізаваліся новыя тры колгасы і ў старыя ўступіла каля 100 гаспадарак.

П. Н. Х.

Комсамольская ячэйка Татаршчынскай школы колгаснай моладзі (Койданаўскага р-ну) да XIII-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі з'арганізавала колгас пад назвай „Гадавіна Кастрычніка“, куды ўступіла 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ячэйка закупіла для колгасу літаратуры і выпісала газэт больш як на 100 рублёў. За добрую работу па колектывізацыі, а таксама і па вярбоўцы ўкладчыкаў у ашчадкасы ячэйка атрымала ад 10-й раённай конфэрэнцыі ЛКСМ Койданаўскага раёну гармонь.

Ст.

У час вайсковага паходу комсамольскага батальёну і сяброў ТСА Авіяхэму мястэчка Бягомля, у вёсцы Макаўі, Мсьціскага сельсавету, з'арганізаваны адзін колгас. Дзякуючы добрай растлумачальнай працы комсамольскага батальёну, у колгасы „Беларусь“ і „Вароўскага“ наглядаецца значны прыліў.

Васіль.

Старадароская райконфэрэнцыя ЛКСМБ, як падарунак IX зьезду УсеЛКСМ і X зьезду ЛКСМБ арганізавала сіламі комсамольцаў колгас з 16 гаспадарак, а таксама новую ячэйку ЛКСМБ 12 асоб. Выклікаем усе райорганізацыі пасьледваць нашаму прыкладу.

Арцюхоў.

Колгас імя СНК БССР, Сухлавіцкага раёну, організаваны вясной гэтага году на плошчы 1500 га. Ня гледзячы на недахоп працоўных рук, колгас пасьпяхова закончыў усе гаспадарчыя кампаніі. У колгас пачаўся прыліў. За апошні час прынята 12 гаспадарак.

Колгасьнік.

У Бялынкавіцкім сельсавеце, Клімковіцкага раёну, у дзень XIII гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі з'арганізаваліся 3 сельска-гаспадарчыя арцелі: у вёсцы Арлоўка, 2-я Малая Крапіўня і Шчаглоўка.

Іскра.

Ва ўрочышчы Вялікі Лес, Білевунаўскага сельсавету, Сьміловіцкага раёну, нядаўна адбыўся сход па пытаньню колектывізацыі, пасьля чаго быў праведзен запіс у колгас. Запісалася 8 гаспадарак, колектыўна вышлі ў поле для сяўбы азімых.

Пост „Ч. З.“ Піск...

Правыя опортуністыя зрываюць загатоўкі

Гадовы плян па хлебазагатоўках у Пухавіцкім раёне выканан толькі на 48,7 проц. Яшчэ горш з бульбазагатоўкамі—плян выканан на 36 проц. Гэтыя ганебныя лічбы гавораць за тое, што партыйна-комсамольскія організацыі раёну зусім мала ўвагі аддалі гэтым кампаніям і не далі цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам.

РВК і сельсаветы адносяцца прымірэнча да кулака. У Балоцкім сельсавеце ні адзін кулак не атрымаў цьвёрдага заданьня. Ёсьць цэлыя вёскі, да якіх планы бульба і хлебазагатовак не даведзены. Сельсавет, разам з партыйна-комсамольскімі ячэйкамі, у гэтым кірунку нічога не робіць.

Нова-Слабодзкі сельсавет знайшоў у сябе ні аднаго кулака, а трэба сказаць, што кулакоў тут няма мала.

Н. Б.

Паведамленьні

* Сёньня, 18-га лістапада, а 6-й гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджаньне конфліктнай камісіі Фрунзэўскага РК ЛКСМБ.

Выклікаюцца ўсе таварышы, якія маюць конфліктныя справы.

Яўка сяброў КК—абавязкова.

Старшыня КК
Старобінец.

* Сёньня, 18 лістапада, а 6-й гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджаньне прыймовай камісіі Фрунзэўскага РК ЛКСМБ.

Выклікаюцца ўсе таварышы, якія павінны прайсьці прыймовую камісію.

ФРК ЛКСМБ

* Брыгада па політэхнізацыі, якая ня была на пасяджэньні 10 лістапада, будзе засядаць 20 лістапада г. м. а 7-й гадзіне ўвечары ў прыродазнаўчым корпусе Унівэрсытэцкага Гарадка (1 паверх 4 пакой).

Усе абраныя ад школ прадстаўнікі павінны зьявіцца ў абавязковым парадку.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

У сераду 19-га лістапада г. г., роўна а 4-й гадзіне дня, у памяшканьні рэдакцыі „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“ (Карла Маркса, 38)

адбудзецца нарада супрацоўнікаў рэдакцыі і МАСТАЦКОРАЎ

па пытаньню організацыі пры газэце мастацкорработы.

На нараду запрашаюцца ўсе мастацкоры г. Менску.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ і МК В-ва „Чырвоная Зьмена“.

Адказны рэдактар—Рэдколег...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Гал оўлітбел № 50...